УДК 902/904

# КАМЕННЫЯ АРТЭФАКТЫ З КАЛЕКЦЫІ ПОМНІКА ГРОДНА 14

*Гаршкоў Аляксандр Дзмітрыевіч*
аспірант кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі
і спецыяльных гістарычных дысцыплін установы адукацыі
«Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы»;
магістр гістарычных навук
(г. Гродна, Рэспубліка Беларусь)

*Дадзены артыкул прысвечаны аналізу каменных артэфактаў атрыманых падчас даследаванняў помніка Гродна 14 у 2020–2021 гг. У калекцыі намі выдзелены дзве групы прадметаў па функцыянальнаму прызначэнню: адбойнікі і выпрамляльнікі. Прызначэнне астатніх артэфактаў застаецца пытаннем дыскусіі.*

**Уводзіны.** Помнік Гродна 14, размешчаны ў паўночна-заходняй частцы г. Гродна, лакалізуецца на правай цокальнай тэрасе р. Нёман, у месцы ўпадзення ў яе безымяннай ручаіны. Асноўную частку дадзенага археалагічнага аб'екта складае стаянка-майстэрня перыяду фінальнага палеаліту (свідэрская культура), якая цягнецца ўжоўж правага берага ручая. А ўстатняй частцы сустракаюцца матэрыялы пазнейшых часоў (позняе сярэднявечча). Адкрыты помнік, выпадкова, у 2020 г. гродзенскім гісторыкам А. Чарнякевічам. У 2020–2022 гг. археалагічныя разведкі і раскопкі на агульнай плошчы 32 кв. м. праведзены аўтарам артыкула. Колькасць калекцыі, на дадзены момант, складае больш за 3000 артэфактаў [1, с. 25–29; 2, с. 24–28]. Большую частку яе складаюць прадукты першаснага расшчаплення крэменю без слядоў выкарыстання. Аднак, у калекцыі таксама прысутнічаюць каменныя артэфакты, аналізу якіх і прысвечаны дадзены артыкул.

**Асноўная частка.** Агульная колькасць каменных артэфактаў зафіксаваных пад час даследаванняў помніка Гродна 14 ў 2021–2022 г. складае 237 адзінак. Частка з іх фарміравала аб'ект, які папярэдне намі інтэпрэтуецца як вогнішча. Усе прадметы можна падзяліць на тры групы: прылады па апрацоўцы крэменю (адбойнікі), прылады па апрацоўцы дрэва (выпрамляльнікі), камяні без відавочных слядоў выкарыстання і іх фрагменты.

*Прылады па апрацоўцы крэменю (адбойнікі).* У калекцыі прысутнічаюць два каменныя артэфакты акруглай формы са слядамі забітасці на выпуклых гранях. Памеры прадметаў: даўжыня – 8,7/8,0 см; шырыня – 6,2/5,6 см; таўшчыня – 5,2/5 см. Пароды каменю (граніты(?)) і вага адбойнікаў (каля 300 г) дазваляе нам іх інтэрпрэтаваць іх цвёрдыя. Дадзены факт дазваляе нам меркаваць, што дадзеныя прадметы выкарыстоўваліся толькі пры першаснай апрацоўцы крамянёвых жаўлакоў і фарміраванні прэнуклеусаў, так як тэхналогія расшчаплення

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

заснавана на эксплуатацыі нуклеусаў пры дапамозе мяккіх каменных адбойнікаў.

*Прылады па апрацоўцы дрэва (выпрамляльнікі).* Сярод камянёў, якія фарміравалі вогнішча або былі размешчаны каля яго, знойдзена два артэфакты (адзін з іх складаўся з двух фрагментаў) з прадольнымі U-падобнымі канаўкамі. Памеры артэфактаў: даўжыня – 15,5/11,3 см; шырыня – 10,6/7 см; таўшчыня – 5,5/2,5 см; глыбіня канаўкі – 0,7/0,3 см. Выкананы яны з буйназярністага чырвонага пясчаніку. Верагодна, дадзеныя артэфакты выкарыстоўваліся як выпрамляльнікі для дрэўкаў дзідаў ці стрэлаў. Такія матэрыялы былі зафіксаваны на фінальнапалеалітычных помніках на тэрыторыі Германіі (Нідэрбібер (Niederbieber), акруга Нойвід (Neuwied), Хінтэрзэе (Hintersee), Гольсэн (Golssen)) [3, s. 37–38].

Для больш позніх перыядаў функцыянальнае выкарыстанне падобнай катэгорыі артэфактаў апісваецца наступным чынам: выпрамляльнік награваўся, і шляхам націскання на патрэбны ўчастак, выпрамляўся/шліфаваўся пэўны кавалак дрэўка [4, с. 109–110]. На карысць гэтай гіпотэзы таксама гаворыць і тое, што гэтыя артэфакты знойдзеныя непасрэдна каля мяркуемага вогнішча.

*Камяні без відавочных слядоў выкарыстаня і іх фрагменты.* Дадзеная катэгорыя прадстаўлена найбольшай колькасцю артэфактаў (233 адз.). У асноўным, гэта фрагменты пясчаннікавых плітак, якія былі фрагментаваны. Верагодна, частка з іх аббівалася чалавекам, так некалькі артэфактаў складваюцца паміж сабой. Не выключна, што некаторыя з пясчаннікаў маглі выкарыстоўвацца ў якасці адбойнікаў пры атрыманні пласцін. Але даказаць гэта, без дадзеных трасалогіі вельмі цяжка.

Акрамя таго, да дадзенай катэгорыі аднесены камяні без слядоў апрацоўкі, якія фарміравалі мяркуемае вогнішча.

**Высновы.** Большая частка калекцыі каменных артэфактаў складаецца з камянёў і фрагментаў камянёў без відавочныях слядоў выкарыстання. Аднак, некаторыя з іх мадытыфікаваліся чалавек, што падцвярджаецца наяўнасцю рэмантажных сувязей. Астатнія групы падстаўлены чатырма артэфактамі, якія, разам з астатнім крамянёвым інвентаром дазваляюць нам атрымаць інфармацыю аб характары крэмнеапрацоўкі і верагоднай, тэхналогіі вырабу дрэвак для дзідаў, дроцікаў або стрэлаў.

### Спіс выкарыстаннай літаратуры


1. Гаршкоў, А. Д. Справаздача аб археалагічных даследаваннях на тэрыторыі Ваўкавыскага і Гродзенскага раёнаў Гродзенскай вобласці ў 2020 годзе / А. Д. Гаршкоў // ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1.
2. Гаршкоў, А. Д. Справаздача аб археалагічных даследаваннях на тэрыторыі Брэсцкай, Гродзенскай і Мінскай абласцей ў 2021 годзе / А. Д. Гаршкоў // ЦНА НАН Беларусі. ФАНД. Воп. 1.
3. Семенов,С. А. Развитие техники в каменном веке / С. А. Семёнов. – АН СССР. Ин-т археологии. – Ленинград : Наука. Ленингр. отд-ние, 1968. – 362 с.
4. Winkler, K. Der spätpaläolithische Fundplatz Golßen, Lkr. Dahme-Spreewald. Analyse der Steinartefakte und Befunde der Grabung von 1968. Veröffentlichungen zur brandenburgischen / K. Winkler // Landesarchäologie – 2010. – 41/42. – S. 7–94.





Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова




А – месцаразмяшчэнне помніка Гродна 14; Б1-2 – выпрамляльнікі.
Карта выканана аўтарам на аснове OpenStreetMap.
Малюнкі Б1-2 – А. Ф. Касюк

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова